ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СУБОТА, 30 ЛІПЕНЯ 1938 г. № 42 (384)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР



Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат Л. Е. ПАПКОЎ.



Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат С. І. МАЛЬЦАЎ.



Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат Н. Я. НАТАЛЕВІЧ.



Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР С. П. МЕЛЬНІКАЎ.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат П. К. ПАНАМАРЭНКА.




Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат С. І. МАРОЗАЎ.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат І. Д. КАВАЛЬКОЎ.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат А. П. МАТВЕЕЎ.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат Д. Е. КАЗАЧОНАК.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат Д. Ф. МАРКІН.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат К. І. КАЗЛОЎ.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат О. К. ШАРКО.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат В. М. ЯГОДКІН.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат С. М. МЕЛКІХ.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат Н. Я. ВІНАКУРАВА.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат О. А. НЕМЧЭНКА.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат А. І. АКУЛЁНАК.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат М. П. КАВАЛЁЎ.



Член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР дэпутат М. М. БАРАНАВА.

Помніць аб капіталістычным абкружэнні

28 ліпеня закончыла сваю работу Першая Сесія Вярхоўнага Совета БССР. Як выбары вышэйшага органа ўлады БССР, так і работа Сесіі і выбары Прэзідыума Вярхоўнага Совета і Соўнаркома БССР адлюстравалі велізарную перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, паказалі высокую палітычную актыўнасць, выключную аднадушнасць беларускага народа, яго згуртаванасць вакол партыі Леніна — Сталіна.

Першым усенародным дэпутатам у Вярхоўны Совет БССР выбран геніяльны чалавек эпохі, тварэц народнага шчасця Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. У складзе дэпутатаў — бліжэйшыя саратнікі таварыша Сталіна, слаўныя прадстаўнікі ленінскай гвардыі, загартаваныя ў баях за соцыялізм таварышы В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, Н. І. Ежоў, А. А. Жданаў.

У складзе соцыялістычнага парламента — лепшыя сталінскія выхаванцы, на праве даказаўшыя сваю адданасць і любоў да радзімы, да партыі Леніна — Сталіна.

106 рабочых, 103 селяніны, 64 служачых і прадстаўнікоў совецкай інтэлігенцыі. Сярод іх 206 членаў і кандыдатаў партыі і 67 беспартыйных, 167 беларусоў, 75 рускіх, 20 яўрэяў, 7 украінцаў і 4 прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Склад народнага парламента яскрава ўвасабляе словы першага артыкула Канстытуцыі нашай рэспублікі.

«Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка ёсць соцыялістычная дзяржава рабочых і сялян».

Ідэйна-палітычнае і маральнае адзінства совецкага народа надае нашай дзяржаве грозную сілу. Мы спакойна глядзім у вочы будучыні, мы ведаем, што калі грымне бура, калі вораг нападзе на нашы граніцы, дык лёсам яго будзе разгром і пагібель.

У рэзультаце разгрому трацкісцка-бухарынскай банды совецкі народ і сусветны рабочы клас выйграў бой з фашызмам. Гэтым разгромам ён аказаў вялікую дапамогу гераічным народам Іспаніі, Кітая і ўсяму рабочаму класу, вядучаму барацьбу з азвярэлым фашызмам.

Рэзультаты выбараў з усёй выразнасцю сведчаць аб велізарнай гатоўнасці беларускага народа па першаму закліку партыі і совецкага ўрада грудзьмі стаць на абарону краіны соцыялізма.

Наша сіла заключаецца яшчэ і ў тым, што ў нашай краіне пачатак дзяржаўнасці і народнасці зліты ў пролетарскай дыктатуры і пролетарскай дэмакратыі. Толькі пры совецкай уладзе любоў да радзімы, любоў да сваёй краіны стала цэласнай, атрымала сапраўдны размах. Совецкі патрыятызм пранізаў усе формы дзейнасці совецкіх людзей, натхняе іх на гераічныя подвігі.

У совецкай краіне армія і народ адзіны, карыстаюцца аднолькавымі правамі дэмакратыі, таму што наша армія ёсць армія рабочых і сялян, яна ёсць армія Кастрычніцкай рэволюцыі, армія дыктатуры пролетарыята. Наша армія з'яўляецца арміяй братэрства паміж народамі нашай краіны, арміяй вызвалення прыгнечаных народаў, арміяй свабоды і незалежнасці народаў нашай краіны.

Праз два дні — 24 гадавіна імперыялістычнай вайны. Гэта — міжнародны дзень барацьбы супроць фашызма і вайны.

Праводзячы антываенны дзень, нельга не ўспомніць аб жахах імперыялістычнай бойні, якая шмат год як скончылася, а да гэтага часу народы свету не могуць залячыць цяжкія раны. За годы вайны было забіта каля 10 мільёнаў людзей квітучага ўзросту. Калі-б гэтых людзей пакласці ў рад адзін да другога, можна было-б укласці мерцвякамі адлегласць у 20 тысяч кілометраў. Параненых, пакалечаных, хворых, застаўшыхся інвалідамі вайна зрабіла каля 20 мільёнаў. Акрамя гэтага, чалавечыя страты ад памяншэння нараджэнняў склалі 20.250.000 і ад павелічэння смяротнасці — 15.130.000 чалавек.

Калі-ж падлічыць страты ад усяго ўзляцеўшага ў паветра, падлічыць разбураныя гарады, музеі, кнігасховішчы, помнікі мастацтваў былых эпох, мірныя сёлы і вёскі, затопленыя параходы і г. д., дык за годы вайны сусветнай гаспадарцы была нанесена велізарная шкода. Па статыстыцы англійскага вучонага Эдгара Клерсмонд, страты па прыблізных падліках складаюць не менш 800 мільярдаў залатых рублёў.

Зараз германска-італьянскі і японскі фашызм ужо вядуць войны і падрыхтоўваюць вялікую, больш жудасную, больш знішчальную вайну, чым была імперыялістычная. Няма ніякага сумнення, што фашысты распалілі-б ужо пажар сусветнай вайны, каб не было такога магутнага ахоўніка міру, як Совецкі Саюз.

Праводзячы палітыку міру, совецкі народ ніколі не забывае слоў таварыша Сталіна, што мы знаходзімся ў капіталістычным абкружэнні. І побач з умацаваннем абараназдольнасці мы развіваем совецкую культуру, якая стала велізарнай сілай, уздзейнічаючай на грамадскае і культурнае жыццё Захаду.

Соцыялістычны характар дасягненняў совецкай тэхнікі, мастацтваў, навукі зараз ужо відавочны для кожнага непрадузятага чалавека. Трыумфальнае шэсце фільмаў «Чапаеў», «Мы з Кранштата», «Дэпутат Балтыкі», захапленне той інтэрпрэтацыяй Шапена і Бетховена, якую паказалі за мяжой нашы маладыя музыканты, прыкланенне перад геніяльнай дасканаласцю і смеласцю нашых лётчыкаў, небывалая павага да нашай навукі, да ўсіх заваёў совецкай культуры — гэтага не можа адмаўляць ніхто.

Гэтыя дасягненні трэба папулярызаваць мастацкімі сродкамі і гэта адказнейшая і ганаровая задача совецкіх пісьменнікаў. Такая папулярызацыя яшчэ больш уздыме аўтарытэт Совецкага Саюза ў вачах працоўных і гэтым самым будзе садзейнічаць умацаванню адзінага антыфашысцкага фронта.

Зараз фронт расцягнуўся вельмі далёка. Ён пачынаецца каля Мадрыда, праходзіць праз усю Еўропу, праз увесь свет. Галоўная асаблівасць гэтага нябачанага баявога фронта ў барацьбе чалавецтва за мір і культуру ў тым, што нідзе вы не знойдзеце зоны цішыні, спакою і нейтральнасці. Таму кожны грамадзянін, любячы свабоду, дэмакратыю, мір і перадавое прагрэсіўнае чалавецтва, знаходзячыся ў любым месцы свету, можа весці барацьбу супроць фашысцкага варварства, калі не зброяй, дык пяром.

Таварыш Сталін гаварыў, што мы павінны свой народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці. А што значыць для пісьменніка быць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці?

Гэта значыць — ствараць высокамастацкія творы, мабілізуючыя народ на барацьбу супроць фашызма і вайны, і ясна прадстаўляць сабе характар сваёй работы ў часе вайны.

Пісьменніку, журналісту ў часе вайны прыдзецца быць палітработнікам, пісаць самыя разнастайныя артыкулы. Калі спатрэбіцца, ён павінен умець чытаць карту, кіраваць машынай, фатаграфіраваць, страляць. Гераічная барацьба народаў Іспаніі і Кітая, падзеі ў Аўстрыі і падрыхтоўка нападу на Чэхаславакію дыктуюць нам паскорыць сваю мабілізацыйную, абаронную падрыхтоўку.

Гэта абавязвае нашых пісьменнікаў ствары́ць кнігі, у якіх-бы барацьба беларускага народа і Чырвонай Арміі за вызваленне радзімы была паказана павучальна і вобразна.

Пад кіраўніцтвам партыі і таварыша Сталіна ў нас створаны адданыя соцыялістычнаму будаўніцтву пісьменніцкія і мастацкія кадры. Перад пісьменніцкай арганізацыяй і работнікамі мастацкага фронта стаіць адказная задача разгортвання абароннай падрыхтоўкі.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб пасяджэнні Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР 1-га склікання 26 ліпеня 1938 года

26 ліпеня ў 11 гадзін раніцы ў вялікай зале пасяджэнняў Дома ўрада адбылося другое пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР першага склікання.

Старшынствуе старшыня Вярхоўнага Совета БССР дэпутат **Грэк Н. Г.**

Першым пытаннем разглядаецца пункт другі парадку дня Сесіі Вярхоўнага Совета БССР — Аб пастаянных камісіях Вярхоўнага Совета БССР.

Дэпутат **Кулагін М. В.** ад групы дэпутатаў Менскай, Магілеўскай і Палескай абласцей, уносіць прапанову аб стварэнні пастаяннай Камісіі **Заканадаўчых меркаванняў.**

Вярхоўным Советам зацвярджаецца састаў Камісіі Заканадаўчых меркаванняў у колькасці 9 чалавек.

У састаў камісіі выбіраюцца:

1. Старшыня камісіі **Беляеў** Спірыдон Маркавіч — дэпутат ад Старасельскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці.

Члены камісіі:

2. **Лодысеў** Сяргей Цярэнцьевіч — дэпутат ад Круглянскай выбарчай акругі Магілеўскай вобласці.

3. **Якімовіч** Іван Кліменцьевіч — дэпутат ад Рэчыцкай гарадской выбарчай акругі Гомельскай вобласці.

4. **Гусеў** Дзімітрый Сцяпанавіч—дэпутат ад Оршанскай сельскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці.

5. **Таміловіч-Данчанка** Сяргей Аляксеевіч — дэпутат ад Брагінскай выбарчай акругі Палескай вобласці.

6. **Краснашэеў** Іван Іовіч — дэпутат ад Глускай выбарчай акругі Палескай вобласці.

7. **Жур** Елена Кірылаўна — дэпутат ад Гарэліцкай выбарчай акругі Менскай вобласці.

8. **Куляшоў** Васілій Паўлавіч — дэпутат ад Нова-Быхаўскай выбарчай акругі Магілеўскай вобласці.

9. **Лежнін** Нікіта Фёдаравіч — дэпутат ад Сенненскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці.

Вярхоўны Совет БССР прымае прапанову, унесеную ад імя групы дэпутатаў Гомельскай і Віцебскай абласцей дэпутатам **Мальцавым** С. І., аб стварэнні пастаяннай **Бюджэтнай камісіі** Вярхоўнага Совета БССР.

Бюджэтная камісія выбіраецца ў ліку 11 чалавек.

1. Старшыня камісіі — **Малін** Уладзімір Нікіфаравіч — дэпутат ад Межынскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці.

Члены камісіі:

2. **Крупеня** Іван Ануфрыевіч — дэпутат ад Дрысенскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці.

3. **Снегаў** Фядот Пракоф'евіч — дэпутат ад Полацкай сельскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці.

4. **Захараў** Сяргей Сцяпанавіч — дэпутат ад Горацкай гарадской выбарчай акругі Магілеўскай вобласці.

5. **Гладышаў** Ефрэм Іванавіч—дэпутат ад Першамайскай выбарчай акругі гор. Бабруйска.

6. **Рашэтнікаў** Нікалай Арцёмавіч — дэпутат ад Грозаўскай выбарчай акругі Менскай вобласці.

7. **Якуш** Пелагея Астапаўна — дэпутат ад Смілавіцкай выбарчай акругі Менскай вобласці.

8. **Кедрык** Васілій Сямёнавіч — дэпутат ад Чырвонаслабодскай выбарчай акругі Менскай вобласці.

9. **Акімаў** Сцяпан Дзімітрыевіч — дэпутат ад Буйнавіцкай выбарчай акругі Палескай вобласці.

10. **Герман** Міхаіл Емельянавіч — дэпутат ад Варашылаўскай выбарчай акругі гор. Гомеля.

11. **Мельнікава** Зінаіда Сцяпанаўна— дэпутат ад Чачэрскай сельскай выбарчай акругі Гомельскай вобласці.

Вярхоўны Совет заслухаў даклад старшыні Мандатнай Камісіі Вярхоўнага Совета БССР тав. **Шыбалкі** Уладзіміра Гаўрылавіча аб праверцы поўнамоцтваў дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР.

Тав. Шыбалка агалашае пастанову Мандатнай Камісіі Вярхоўнага Совета БССР аб рэзультаце праверкі поўнамоцтваў дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР па 273 выбарчых акругах.

«Праверыўшы ўсе прадстаўленыя Цэнтральнай выбарчай камісіяй выбарчыя дакументы і матэрыялы па выбарах у Вярхоўны Совет БССР, асобна на кожнага дэпутата Вярхоўнага Совета БССР па 273 выбарчых акругах, Мандатная Камісія Вярхоўнага Совета БССР устанаўлівае:

1. Выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР па ўсіх 273 выбарчых акругах праведзены на падставе і ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР і «Палажэннем аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

2. Ніякіх падстаў для касіравання выбараў па якой-небудзь выбарчай акрузе, а таксама ніякіх скарг і заяў па выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР на парушэнне Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах» як па выбарчых акругах, так і ў Цэнтральнай выбарчай камісіі не маецца.

На падставе выкладзенага Мандатная Камісія Вярхоўнага Совета БССР прызнае правільнасць поўнамоцтваў усіх дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР, зарэгістраваных у Цэнтральнай выбарчай камісіі, спіс якіх апублікован у газетах «Звязда» і «Советская Белоруссия» ад 29 чэрвеня 1938 г.».

У спрэчках па дакладу Мандатнай Камісіі ад імя групы дэлегатаў Менскай, Магілеўскай і Гомельскай абласцей выступіў дэпутат ад Халопеніцкай выбарчай акругі Менскай вобласці тав. **Ячменеў** Георгій Фокавіч.

Вярхоўны Совет прымае наступную пастанову па дакладу Мандатнай Камісіі:

1. Зацвердзіць даклад Мандатнай Камісіі аб прызнанні правільнымі поўнамоцтваў дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР, выбраных па ўсіх 273 выбарчых акругах і зарэгістраваных у Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР.

2. Лічыць работу Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР закончанай.

Пасля прыняцця пастановы па дакладу Мандатнай Камісіі Вярхоўны Совет пераходзіць да разгляду трэцяга пункта парадку дня — Аб унясенні змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі БССР.

З дакладам па гэтаму пытанню выступіў тав. **Ермак** Аляксей Васільевіч — дэпутат ад Камаровіцкай выбарчай акругі Палескай вобласці.

На гэтым ранішняе пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР закачваецца. (БЕЛТА).

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АБ СКЛІКАННІ ДРУГОЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

У адпаведнасці з артыкулам 46 Канстытуцыі СССР склікаць Другую Сесію Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік 10 жніўня 1938 г. у гор. Маскве.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 26 ліпеня 1938 г.

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР 1-га СКЛІКАННЯ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ПАСЯДЖЭННІ ПЕРШАЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР 1-га СКЛІКАННЯ 26 ЛІПЕНЯ 1938 ГОДА

26 ліпеня ў 6 гадзін вечара ў вялікай зале пасяджэнняў Дома ўрада адбылося трэцяе пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР першага склікання.

Старшынствуе старшыня Вярхоўнага Совета БССР дэпутат **Грэк Н. Г.**

У спрэчках па дакладу дэпутата **Ермака А. В.** аб унясенні змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі БССР выступілі дэпутаты **Матвееў А. П.** (Ленінская выбарчая акруга горада Менска), **Захараў А. І.** (Новабарысаўская выбарчая акруга. Менская вобласць) і **Ханіна Е. С.** (Вакзальная выбарчая акруга гор. Віцебска).

Па сканчэнні спрэчак Вярхоўны Совет пераходзіць да паартыкульнага чытання і галасавання ўнесеных змен і дадаткаў.

Вярхоўны Совет БССР прымае наступную пастанову аб унясенні змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі (асноўны закон) БССР:

«АБ ЗМЕНЕ І ДАПАЎНЕННІ АРТ. АРТ. 14, 19, 25, 31, 43, 44, 45, 48, 52, 53, 54, 56, 58, 59, 61, 63, 66, 67, 68, 69, 70, 71, 72, 73, 74, 75, 79, 80, 84, 90, 91, 109, 118 і 119 КАНСТЫТУЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ.

Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1) У адпаведнасці з зацвярджэннем Вярхоўным Советам СССР утварэння ў саставе Беларускай ССР абласцей: Віцебскай, Гомельскай, Менскай, Магілеўскай і Палескай, ізлажыць арт. 14 Канстытуцыі Беларускай ССР наступным чынам:

«Артыкул 14. Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка складаецца з абласцей: Віцебскай, Гомельскай, Менскай, Магілеўскай і Палескай».

2) У адпаведнасці са зменамі і дапаўненнямі арт. арт. 29, 70, 77, 78 і 83 Канстытуцыі СССР, унесці наступныя змены і дапаўненні ў Канстытуцыю Беларускай ССР:

а) Артыкул 19 пп. «б» і «ж» ізлажыць наступным чынам:

«б) устанаўленне граніц і раённага дзялення абласцей, а таксама прадстаўленне на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета СССР утварэння новых абласцей у саставе БССР»;

«ж) устанаўленне ў адпаведнасці з заканадаўствам СССР, дзяржаўных і мясцовых падаткаў, збораў і непадатковых даходаў, а таксама кіраўніцтва ажыццяўленнем мясцовых бюджэтаў абласцей»;

Артыкул 31 п. «г» ізлажыць наступным чынам:

«г) адмяняе пастановы і распараджэнні Совета Народных Камісараў БССР, а таксама рашэнні і распараджэнні абласных Советаў дэпутатаў працоўных у выпадку іх неадпаведнасці законам»;

Артыкул 43 п. «д» ізлажыць наступным чынам:

«д) кіруе і правярае работу выканаўчых камітэтаў абласных Советаў дэпутатаў працоўных»;

Артыкул 44 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 44. Совет Народных Камісараў БССР мае права адмяняць рашэнні і распараджэнні выканаўчых камітэтаў абласных Советаў дэпутатаў працоўных, а таксама прыпыняць рашэнні і распараджэнні абласных Советаў дэпутатаў працоўных.

Совет Народных Камісараў БССР мае права адмяняць загады і інструкцыі Народных Камісараў БССР».

У артыкуле 45 словы: «Унутранага гандлю» замяніць словам: «Гандлю», словы: «Упаўнаважанага Камітэта Загатовак СССР» — выключыць;

У арт. арт. 48 і 72 словы: «Унутранага гандлю» замяніць словам: «Гандлю»;

У арт. арт. 52, 53, 54, 56, 58, 61, 63, 68, 75, 79, 80, 84 і 109 словы: «акругах», «акруговыя», «акругі», «акруговых», «акруговаму», «акруг», «акруговымі» — замяніць словамі: «абласцях», «абласныя», «вобласці», «абласных», «абласному», «абласцей», «абласнымі»;

Артыкул 59 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 59. Сесіі абласных Советаў дэпутатаў працоўных склікаюцца іх выканаўчымі камітэтамі не менш чатырох разоў у год;

Сесіі раённых Советаў дэпутатаў працоўных склікаюцца іх выканаўчымі камітэтамі не менш шасці разоў у год»;

Артыкул 66 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 66. Абласныя Советы дэпутатаў працоўных утвараюць ніжэйнаступныя аддзелы выканаўчых камітэтаў:

Зямельны;
Фінансавы;
Гандлю;
Аховы здароўя;
Народнай асветы;
Мясцовай прамысловасці;
Комунальнай гаспадаркі;
Соцыяльнага забеспячэння;
Дарожны;
Агульны;
Па справах мастацтваў;
Планавую камісію;

Сектар кадраў пры старшыні выканкома,

і, апрача таго, у адпаведнасці з асаблівасцямі гаспадаркі вобласці, з зацвярджэння саюзна-рэспубліканскіх народных камісарыятаў Лёгкай прамысловасці, Харчовай прамысловасці, Лясной прамысловасці, Зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў абласныя Советы дэпутатаў працоўных утвараюць аддзелы або ўпраўленні:

Лёгкай прамысловасці;
Харчовай прамысловасці;
Лясной прамысловасці;
Зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў»;

Артыкул 67 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 67. У адпаведнасці з умовамі вобласці, на аснове законаў СССР і БССР, агульнасаюзныя народныя камісарыяты і Народны камісарыят унутраных спраў утвараюць пры абласных Советах дэпутатаў працоўных свае ўпраўленні»;

Артыкул 69 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 69. Раённыя Советы дэпутатаў працоўных утвараюць ніжэйнаступныя аддзелы выканаўчых камітэтаў:

Зямельны;
Народнай асветы;
Фінансавы;
Гандлю;
Аховы здароўя;
Соцыяльнага забеспячэння;
Агульны;
Дарожны;
Планавую камісію;

Сектар кадраў пры старшыні выканкома;

і, апрача таго, у адпаведнасці з асаблівасцямі гаспадаркі раёна, з зацвярджэння абласнога Совета дэпутатаў працоўных раённыя Советы дэпутатаў працоўных утвараюць аддзелы: комунальны і мясцовай прамысловасці»;

Артыкул 70 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 70. У адпаведнасці з умовамі раёна, на аснове законаў СССР і БССР, з зацвярджэння адпаведнага абласнога Совета дэпутатаў працоўных Народны камісарыят унутраных спраў утварае пры раённых Советах дэпутатаў працоўных свае ўпраўленні»;

Артыкул 71 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 71. Аддзелы раённых Советаў дэпутатаў працоўных падпарадкоўваюцца ў сваёй дзейнасці як раённаму Совету дэпутатаў працоўных і яго выканаўчаму камітэту, так і адпаведнаму аддзелу абласнога Совета дэпутатаў працоўных»;

Артыкул 73 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 73. Аддзелы гарадскіх Советаў дэпутатаў працоўных падпарадкоўваюцца ў сваёй дзейнасці як гарадскому Совету дэпутатаў працоўных і яго выканаўчаму камітэту, так і адпаведнаму аддзелу раённага Совета дэпутатаў працоўных, або непасрэдна адпаведнаму аддзелу абласнога Совета дэпутатаў працоўных»;

Артыкул 74 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 74. Аддзелы гарадскіх Советаў дэпутатаў працоўных Бабруйска, Барысава, Віцебска, Гомеля, Менска, Магілева, Мозыра, Оршы, Полацка, Рэчыцы і Слуцка падпарадкоўваюцца ў сваёй дзейнасці як Советам дэпутатаў працоўных гэтых гарадоў і іх выканаўчым камітэтам, так і адпаведнаму аддзелу абласнога Совета дэпутатаў працоўных непасрэдна»;

Артыкул 90 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 90. Пракурор БССР і абласныя пракуроры назначаюцца пракурорам СССР тэрмінам на 5 гадоў»;

У артыкуле 91 слова: «акруговыя» выключыць;

У артыкуле 118 п. «а» ізлажыць наступным чынам:

«а) у абласны Совет дэпутатаў працоўных — адзін дэпутат не менш чым ад 8.000 і не больш чым ад 10.000 чалавек насельніцтва»;

3) Арт. арт 25 і 119 ізлажыць наступным чынам:

«Артыкул 25. Законы, прынятыя Вярхоўным Советам БССР, публікуюцца на беларускай і рускай мовах за подпісамі старшыні і сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР»;

«Артыкул 119. Дзяржаўны герб Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі састаіць з ізабражэння ў праменнях узыходзячага сонца сярпа і молата, акружаных вянком, які састаіць злева з жытніх каласоў, перапляценых канюшынай, і справа — з жытніх каласоў, перапляценых ільном; уніз паміж абодвума паловамі вянка знаходзіцца частка зямнога шара. Абедзве паловы вянка перавіты чырвонай лентай, на якой змешчаны надпісы на беларускай і рускай мовах: «Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!» і ніжэй— ініцыялы «БССР». Уверсе герба знаходзіцца пяцікачечная зорка».

***

На гэтым трэцяе пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР закрываецца.

(БЕЛТА).



ГРУПА ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР і БССР. Злева направа: маёр-ордэнаносец тав. ПАПОЎ Ф. С., маёр тав. КАЛІНІЧЭЎ Т. В., тав. ЛЕВІН М. Г., малодшы ваентэхнік тав. ГАНЧАРОЎ В. М., тав. БАТОЎКІН Н. Е., лейтэнант-ордэнаносец тав. НАВІЦКІ Д. Я., тав. СЦЯПАНАВА М. А. і тав. ХРАМАЯ Ф. І.
Фото Л. Мазелева і В. Вернер (СФ).

Інфармацыйнае паведамленне

Аб пасяджэнні Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР першага склікання 27 ліпеня 1938 года

27-га ліпеня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Дома ўрада адбылося 4-е пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР першага склікання.

Старшынствуе старшыня Вярхоўнага Совета БССР дэпутат Грэк Н. Г.

Першым пытаннем разглядаецца пункт 4 парадку дня—аб пакрыцці дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР выдаткаў, звязаных з выкананнем дэпутацкіх абавязкаў. Па прапанове дэпутата ад Полацкай гарадской выбарчай акругі Віцебскай вобласці **Уралавай Еўдакіі Ільінічны** Вярхоўны Совет БССР прымае наступную пастанову:

1. Устанавіць для дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР пакрыццё выдаткаў, звязаных з выкананнем дэпутацкіх абавязкаў, штомесячна па 500 руб.

2. Для пакрыцця выдаткаў дэпутатаў за перыяд Сесіі Вярхоўнага Совета БССР устанавіць сутачныя ў размеры 75 руб.

3. Устанавіць для дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР пастаянныя білеты на права бясплатнага праезду па ўсіх чыгуначных і водных шляхах БССР.

4. Прадугледзець па каштарысу Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР водпуск у распараджэнне Старшыні Вярхоўнага Совета БССР 100 тысяч рублёў у год на выдаткі па зносінах з дэпутатамі і на прадстаўніцтва.

Затым Вярхоўны Совет БССР прыступае да абмеркавання наступнага пытання — выбрання Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР.

Ад Совета старэйшын Вярхоўнага Совета БССР выступае з прамовай дэпутат Шэвелеў М. Н.

Выклаўшы меркаванні, якія па думцы Совета старэйшын павінны быць пакладзены ў аснову выбрання Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, дэпутат тав. Шэвелеў М. Н. агалашае кандыдатаў, вылучаных Советам старэйшын у Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР.

Персанальным галасаваннем кожнага кандыдата Вярхоўны Совет БССР выбірае Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР у наступным саставе:

СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

1. **НАТАЛЕВІЧ Нікіфар Якаўлевіч** — дэпутат ад Оршанскай гарадской выбарчай акругі, Віцебскай вобласці.

НАМЕСНІКІ СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

2. **МЕЛЬНІКАЎ Сяргей Пятровіч** — дэпутат ад Лепельскай выбарчай акругі, Віцебскай вобласці.

3. **МАЛЬЦАЎ Сяргей Іванавіч** — дэпутат ад Гомельскай сельскай выбарчай акругі, Гомельскай вобласці.

САКРАТАР ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

4. **ПАПКОЎ Лазар Еўдакімавіч** — дэпутат ад Ходасаўскай выбарчай акругі, Магілеўскай вобласці.

ЧЛЕНЫ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

5. **ПАНАМАРЭНКА Панцелеймон Кандрацьевіч** — дэпутат ад Віцебскай-Кагановіцкай выбарчай акругі.

6. **МАРОЗАЎ Сяргей Іванавіч** — дэпутат ад Цімкавіцкай выбарчай акругі, Менскай вобласці.

7. **КАВАЛЬКОЎ Іван Давідавіч** — дэпутат ад Брагінскай выбарчай акругі, Палескай вобласці.

8. **МАТВЕЕЎ Александр Паўлавіч** — дэпутат ад Ленінскай выбарчай акругі гор. Менска.

9. **МАРКІН Дзмітрый Фёдаравіч** — дэпутат ад Калінкавіцкай выбарчай акругі, Палескай вобласці.

10. **КАЗАЧОНАК Дзмітрый Еўдакімавіч** — дэпутат ад Бешанковіцкай сельскай выбарчай акругі, Віцебскай вобласці.

11. **КАЗЛОЎ Кірыл Ісідаравіч** — дэпутат ад Высокскай выбарчай акругі, Магілеўскай вобласці.

12. **ЯГОДКІН Васілій Міхайлавіч** — дэпутат ад Быхаўскай гарадской выбарчай акругі, Магілеўскай вобласці.

13. **ШАРКО Ольга Канстанцінаўна** — дэпутат ад Самахвалавіцкай выбарчай акругі, Менскай вобласці.

14. **МЕЛКІХ Сяргей Міхеевіч** — дэпутат ад Гомельскай-Кіраўскай выбарчай акругі.

15. **ВІНАКУРАВА Надзежда Якаўлеўна** — дэпутат ад Кіраўскай выбарчай акругі, Магілеўскай вобласці.

16. **НЕМЧАНКА Ольга Афанасьеўна** — дэпутат ад Віцебскай-Кіраўскай выбарчай акругі.

17. **АКУЛЕНАК Анна Іосіфаўна** — дэпутат ад Магілеўскай-Ленінскай выбарчай акругі.

18. **КАВАЛЕЎ Міхаіл Пракоф'евіч** — дэпутат ад Каладзішчанскай выбарчай акругі, Менскай вобласці.

19. **БАРАНАВА Марыя Міхайлаўна** — дэпутат ад Свяцілавіцкай выбарчай акругі, Гомельскай вобласці.

На пасяджэнне Вярхоўнага Совета БССР прыбылі дэлегацыі ад рабочых, работніц, калгаснікаў, калгасніц, інтэлігенцыі і служачых і ад пагранічных войск НКВД.

Ад імя дэлегацыі часавых граніц выступае пагранічнік тав. Жамчужны, ад дэлегацыі калгаснікаў БССР—тав. Лысенка, ад рабочых і ІТР фабрык і заводаў — тав. Жылінскі, майстар завода імя Варашылава.

На гэтым чацвертае пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР закрываецца.

(БЕЛТА).

35-годдзе ДРУГОГА З'ЕЗДА РСДРП

Другі з'езд РСДРП

—о—

Ем. ЯРАСЛАЎСКІ

★ ★ ★

Другі з'езд Расійскай соцыял-дэмакратычнай рабочай партыі (Брусель — Лондан, 30 ліпеня—23 жніўня 1903 г.) займае выключна вялікае месца ў гісторыі арганізаванага рабочага руху, у гісторыі рускай рэволюцыі. Другі з'езд партыі праходзіў у абстаноўцы пералому ў развіцці міжнароднага рабочага руху ў выніку пераходу капіталізма ў яго апошнюю стадыю — імперыялізм, у абстаноўцы нарастання рэволюцыйнага руху ў Расіі і ператварэння рускага рабочага класа ў авангард міжнароднага рэволюцыйнага пролетарыята.

Рабочы рух у Расіі к пачатку XX стагоддзя ўзнімаецца на вышэйшую ступень. 1 мая 1900 г. 10 тысяч рабочых Харкава вышлі на дэманстрацыю з рэволюцыйнымі лозунгамі: 8-гадзінны рабочы дзень і палітычная свабода. У 1901 г. у Закаўказзі некалькі тысяч тыфліскіх рабочых пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна па-баявому адзначылі першамайскае свята. У 1901 г. першамайская стачка рабочых Обухаўскага завода ў Пецербурзе ператварылася ва ўзброеную сутычку з паліцыяй і жандарамі.

1901—1902 гг. адзначаны ростам палітычных дэманстрацый у краіне. У сакавіку 1902 г. таварыш Сталін арганізаваў 6-тысячную дэманстрацыю батумскіх рабочых, якая закончылася ўзброенай сутычкай з жандарамі і паліцыяй. Батумская дэманстрацыя, арганізаваная таварышам Сталіным, ускалыхнула рабочых і сялян Закаўказзя і поўдня Расіі. У лістападзе 1902 г. адбыліся буйныя стачкі і масавы палітычны сход, у якім прынялі ўдзел 30 тысяч рабочых Растова-на-Дану.

Батумская і растоўская дэманстрацыі 1902 г. наглядна паказалі, што рабочы клас Расіі вырас у магутную рэволюцыйную сілу. Ленін бачыў у батумскай і растоўскай стачках і дэманстрацыях пралог да паўстання.

Першамайскія дэманстрацыі ў наступным 1903 годзе адбываліся ў 63 гарадах Расіі. Летам 1903 г. разгарнуліся ўсеагульныя стачкі рабочых на поўдні Расіі, у Закаўказзі — Тыфлісе. Баку, Батуме, рабочых цэнтрах Украіны — Екацерынаславе, Одэсе і іншых гарадах. У гэтых масавых палітычных стачках і дэманстрацыях прымала ўдзел звыш 200 тысяч рабочых.

Палітычныя выступленні рабочага класа аказалі ўплыў на рэволюцыйны рух сярод сялянства. У Еўрапейскай Расіі ў 1902 г. было 340 сялянскіх выступленняў супроць памешчыкаў і царскай улады. Адлюстраваннем рэволюцыйнай барацьбы рабочага класа з'яўляліся рэволюцыйныя выступленні студэнцтва, выступленне земскіх дзеячоў і т. п.

Трэба было адстаяць самастойнасць рабочага руху, замацаваць палітычны ўздым у рабочым класе. Гэта магла зрабіць толькі баявая рэволюцыйная партыя. Але ў рабочага класа к пачатку XX стагоддзя не было яшчэ партыі з адзінай праграмай, з яснымі тактычнымі ўстаноўкамі, з чоткімі арганізацыйнымі прынцыпамі. Як вядома, І з'езд РСДРП, які адбываўся ў сакавіку 1898 г., не стварыў і не мог стварыць такой партыі. Соцыял-дэмакратычны рух быў раздроблены, ішоў самапёкам, у ім панавала саматужніцтва. Мясцовыя арганізацыі там-сям былі захоплены ворагамі пролетарскай палітыкі і пролетарскай партыі — так званымі эканамістамі.

У лютым 1900 г. канчаўся тэрмін сібірскай ссылкі Леніна. Калі ён пакідаў ссылку, у яго быў распрацаван канкрэтны план барацьбы за стварэнне пролетарскай партыі на непахісных асновах рэволюцыйнага марксізма. Важнейшым сродкам для дасягнення гэтай мэты Ленін лічыў арганізацыю агульнарускай палітычнай газеты. Ленін пачаў упорную работу над стварэннем такой газеты.

У снежні 1900 г. вышаў першы нумар «Искры». Ленін быў арганізатарам тварцом, душою «Искры». Ленін ад рэдакцыі «Искры» вёў перапіску з мясцовымі арганізацыямі ў Расіі. Няма ні аднаго пытання праграмы. стратэгіі, тактыкі і арганізацыі партыі рабочага класа, на які Ленін не даў бы адказу ў сваіх шматлікіх артыкулах у «Искре», у журнале «Заря», у выдатнай кнізе «Что делать?» і іншых сваіх работах іскраўскага перыяда.

Ленінская «Искра» ставіла сваёй задачай стварыць партыю рабочага класа. Для гэтага падрыхтоўваўся ІІ з'езд РСДРП. Але для таго, каб гэты з'езд быў склікан, трэба было разграміць апартуністаў, стварыць рэволюцыйныя соцыял-дэмакратычныя арганізацыі на месцах, у Расіі выкаваць ідэйнае і арганізацыйнае адзінства рэволюцыйнай соцыял-дэмакратыі. Вось чаму Ленін у «Искре» паставіў раней за ўсё задачу: «Перш, чым аб'ядноўвацца, і для таго, каб аб'яднацца, мы павінны спачатку рашуча і пэўна размежавацца».

Трэба было раней за ўсё размежавацца з эканамізмам — гэтай рускай разнавіднасцю міжнароднага апартунізма. Ленінская «Искра» высока ўзняла сцяг барацьбы супроць міжнароднага апартунізма, за рэволюцыйны марксізм.

Ленінская «Искра» змагалася за стварэнне баявой цэнтралізаванай партыі, канспіратыўнай партыйнай арганізацыі, састаячай з прафесіянальных рэволюцыянераў, якая магла-б аб'яднаць і ўзначаліць барацьбу рабочага класа і ўсіх яго арганізацый. «Дайце нам, — пісаў Ленін, — арганізацыю рэволюцыянераў — і мы перавернем Расію!».

Велізарнае значэнне ў справе стварэння партыі новага тыпу. здольнай весці масы ў бой супроць царызма супроць памешчыкаў і капіталістаў мела кніга Леніна «Что делать?» і вышаўшая некалькі пазней у Закаўказзі, пераклікаўшаяся з кнігай «Что делать?» брашура таварыша Сталіна «Вскользь о партийных разногласиях».

У 1901 г. з розных асколкаў народніцкіх груп ствараецца дробнабуржуазная партыя соцыялістаў-рэволюцыянераў. Ленін накіроўвае ўсю астрату сваёй крытыкі супроць эсэраў, асабліва — супроць эсэраўскага тэрарызма, які з'яўляецца выражэннем антынароднай, дробнабуржуазнай тэорыі народнікаў аб «героях», якія робяць гісторыю, і «натоўпу», які пасіўна ўдзельнічае ў рэволюцыі.

Тым больш небяспечны былі ў гэты момант спробы там-сям — у Саратаве і на Урале — стварэння аб'яднаных арганізацый соцыял-дэмакратаў і соцыялістаў-рэволюцыянераў. Адным з праваднікоў такога бяспрынцыпнага аб'яднання ў Саратаве быў Рыкаў, які пасля аказаўся прадажным агентам фашызма.

Ва ўпорнай барацьбе з ворагамі рэволюцыйнага марксізма ствараліся іскраўскія арганізацыі на месцах. Моцная ленінска-іскраўская арганізацыя склалася ў Закаўказзі, асновапаложнікам якой з'яўляўся таварыш Сталін. У лютым 1903 г. створан быў «Каўказскі соцыял-дэмакратычны рабочы саюз».

У рэзультаце работы іскраўцаў у Расіі да «Искры» далучыліся буйнейшыя арганізацыі РСДРП. Цяпер з'езд быў крайне неабходны.

Быў створан Арганізацыйны Камітэт па скліканню другога з'езда партыі. «Искра», яе арганізацыйны план атрымалі вялікую перамогу.

«Перамога гэтага плана заклала фундамент той згуртаванай і загартаванай комуністычнай партыі, роўнай якой не ведае свет». (Сталін—«Ленін, як арганізатар расійскай комуністычнай партыі»).

Работа Леніна над праграмай партыі пачалася, як вядома, з сярэдзіны 90-х гадоў, праект праграмы быў складзен Леніным яшчэ ў турме, у «доме папярэдняга заключэння» ў Пецербурзе. Калі ў рэдакцыі «Искры» пачалося абмеркаванне праграмы, большасць рэдакцыі, якая складалася з удзельнікаў плеханаўскай групы «Вызваленне працы», падтрымала Плеханава, і ў аснову абмеркавання быў пакладзен праект праграмы, складзены ім у канцы 1901 г. Плеханаў пагразіў расколам, калі ў аснову будзе пакладзен праект праграмы, прадстаўлены ў пачатку 1902 г. Леніным. Усе спробы ўзгадніць абодва праекты натыкнуліся на супраціўленне самаўлюбёнага Плеханава. У праекце Плеханава было многа буйнейшых прынцыповых памылак па асноўных пытаннях рэволюцыі.

Каб ацаніць значэнне плеханаўскіх памылак, дастаткова напомніць, што ў яго праекце праграмы нічога не было сказана аб такім рашаючым патрабаванні марксізма, як дыктатура пролетарыята. Ленін настаяў на ўключэнні ў праграму гэтага асноўнага патрабавання рэволюцыйнага марксізма. «Прызнанне неабходнасці **дыктатуры** пролетарыята **самым цесным і неразрыўным чынам** звязана з палажэннем Комуністычнага Маніфеста, што пролетарыят **адзін толькі** ёсць сапраўды рэволюцыйны клас», — пісаў Ленін.

Ленін падверг рэзкай крытыцы плеханаўскае выкладанне ходу развіцця капіталізма. Плеханаў, з аднаго боку, у значнай ступені згладжваў станоўчыя тэндэнцыі развіцця капіталізма, а з другога боку, змазваў асаблівасці гэтага развіцця капіталізма ў Расіі. Таму Ленін лічыў непрыемлемым увесь тып плеханаўскай праграмы. Ленін лічыў гэты праект не праграмай практычна змагаючайся партыі, а хутчэй праграмай для навучаючыхся першага курса, «на якім гавораць аб капіталізме наогул, а яшчэ не аб рускім капіталізме».

Гэта барацьба Леніна супроць буйнейшых тэарэтычных і тактычных меншавіцкіх памылак, нагрмаджоных у праекце праграмы Плеханава, прывяла да таго, што праграма была значна палепшана, не гледзячы на супраціўленне членаў рэдакцыі «Искры», якія падтрымлівалі Плеханава і «не жадалі яго пакрыўдзіць».

Аўтарам аграрнай праграмы, прапанаванай ІІ з'езду, быў Ленін. Асноўнае патрабаванне, якое высунуў у аграрнай праграме Ленін, было патрабаванне звароту сялянам адрэзкаў, якія з'яўляліся сродкам закабалення памешчыкамі сялян і захавання астаткаў прыгонніцтва. Зварот сялянам адрэзкаў быў таксама і сродкам раскачкі сялянскага руху. Але зварот адрэзкаў сялянам Ленін уяўляў сабе толькі як пераходную меру, як дзверы: у гэтыя дзверы перш за ўсё трэба ўвайсці для таго, каб ісці далей, для таго, каб па адкрытай, па шырокай дарозе ісці да самага канца, да поўнага вызвалення ўсяго працоўнага народа ў Расіі.

Ленін пры пэўных умовах, пры далейшым развіцці рэволюцыі, лічыў магчымым выставіць патрабаванне канфіскацыі ўсёй памешчыцкай зямлі і нацыяналізацыі яе.

Супроць прапановы Леніна выступілі яшчэ ў рэдакцыі «Искры» Плеханаў. Аксельрод і Мартаў, якія лічылі недапушчальным выстаўленне патрабавання нацыяналізацыі зямлі ў буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі.

***

17 ліпеня (30 ліпеня па новаму стылю) 1903 года ў Бруселі адкрыўся ІІ з'езд РСДРП.

На з'ездзе былі прадстаўлены чатыры групіроўкі: «цвёрдыя» іскраўцы (ленінцы) — 20 дэлегатаў і 24 галасы, «мяккія» іскраўцы (Мартаў, Троцкі, Аксельрод і інш.)—9 галасоў, «балота» (прадстаўнікі «Паўднёвага рабочага» і інш.) — 10 галасоў і антыіскраўцы — 8 галасоў (3 эканамісты і 5 бундаўцаў).

Прапанаваная рэдакцыяй «Искры» праграма партыі, выпрацаваная ў выніку буйнай дыскусіі і прыняцця ленінскіх папраўак, была лепшай з праграм міжнароднай соцыял-дэмакратыі. У праграме было ясна сказана, што Расійская соцыял-дэмакратычная рабочая партыя ставіць сваёй задачай соцыяльную рэволюцыю і што «неабходную ўмову гэтай соцыяльнай рэволюцыі складае дыктатура пролетарыята, г. зн. заваяванне пролетарыятам такой палітычнай улады, якая дазволіць яму падавіць усякае супраціўленне эксплуататараў».

Заваяванню дыктатуры пролетарыята павінна папярэднічаць барацьба за звяржэнне царскага самадзяржаўя, перамога буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі. «Цвёрдыя» іскраўцы і тады, на ІІ з'ездзе, разглядалі ажыццяўленне дэмакратычных задач, як сродак, які палягчае далейшую барацьбу за

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР 1-га СКЛІКАННЯ

Урад БССР — Совет Народных Камісараў БССР — выбраны Першай Сесіяй Вярхоўнага Совета Беларускай ССР. На здымку (злева направа): М. В. Кулагін — намеснік старшыні Соўнаркома, К. В. Кісялёў—старшыня Соўнаркома БССР, І. А. Захараў — намеснік старшыні Соўнаркома, І. Л. Чорны — старшыня Дзяржаўнай планавай камісіі, В. Г. Ванееў — нарком гандлю, С. Ц. Лодысеў — нарком юстыцыі, Е. І. Уралава — нарком асветы, А. А. Наседкін — нарком унутраных спраў, І. А. Новікаў — нарком аховы здароўя, А. Б. Озірскі—начальнік Упраўлення па справах мастацтваў, І. І. Горын — нарком харчовай прамысловасці, І. С. Каровін — нарком мясцовай прамысловасці, В. С. Забела — нарком комунальнай гаспадаркі, П. А. Кальцоў — нарком земляробства, В. І. Дзмітрыеў — нарком лёгкай прамысловасці. У першым радзе: І. З. Сцяпанаў — нарком фінансаў, В. Б. Гайсін — нарком лясной прамысловасці, Е. Т. Гуцянкова — нарком сацыяльнага забеспячэння, А. І. Дружынін — нарком зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў і В. П. Капусцін — начальнік Дарожнага ўпраўлення.

Фото С. Грына («Заазда»).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Аб пасяджэнні Першай Сесіі Вярхоўнага Совета Беларускай ССР 1-га склікання 28 ліпеня 1938 года

28 ліпеня, у 11 гадзін раніцы, у зале пасяджэнняў Дома ўрада адбылося пятае пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР. Старшынствуе старшыня Вярхоўнага Совета БССР дэпутат Грэк Н. Г.

Вярхоўны Совет БССР прыступае да абмеркавання апошняга пункта парадку дня — Утварэнне ўрада БССР — Совета Народных Камісараў БССР.

Старшыня Вярхоўнага Совета БССР Грэк Н. Г. агалашае наступную заяву старшыні Совета Народных Камісараў БССР — дэпутата Кавалёва А. Ф.:

«У адпаведнасці з арт. 45 Канстытуцыі БССР і ў сувязі з тым, што ў парадак дня Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР пастаўлена на разгляд пытанне аб утварэнні ўрада, Совет Народных Камісараў БССР лічыць свае абавязкі вычарпанымі і складае свае паўнамоцтвы перад Вярхоўным Советам.

Совет Народных Камісараў БССР просіць давесці аб гэтым да ведама Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР А. Кавалёў.

28 ліпеня 1938 г.».

Вярхоўны Совет пераходзіць да абмеркавання заявы старшыні Совета Народных Камісараў БССР.

Выступіўшыя ў спрэчках дэпутаты— Мельнікаў С. П. (Лепельская выбарчая акруга, Віцебская вобласць), Маркін Д. Ф. (Калінкавіцкая выбарчая акруга, Палеская вобласць), Кавалькоў І. Д. (Брагінская сельская выбарчая акруга, Палеская вобласць), Гусеў Д. С. (Оршанская сельская выбарчая акруга, Віцебская вобласць) падверглі крытыцы дзейнасць Соўнаркома БССР і яго асобных наркаматаў (Народнага Камісарыята Земляробства, Народнага Камісарыята Асветы, Народнага Камісарыята Гандлю, Народнага Камісарыята Мясцовай Прамысловасці, Народнага Камісарыята Лясной Прамысловасці, Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, Упаўнаважаных Народнага Камісарыята Загатовак і Народнага Камісарыята Сувязі Саюза ССР).

На Сесіі таксама выступіў дэпутат Кавалёў А. Ф.

Па прапанове дэпутата Брыкава Афанасія Данілавіча (Бярэзінская выбарчая акруга, Менская вобласць) Вярхоўны Совет БССР прымае наступную пастанову:

«Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі выражае давер'е Совету Народных Камісараў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Разам з тым, улічваючы крытычныя заўвагі выступіўшых дэпутатаў — Мельнікава С. П., Маркіна Д. Ф., Кавалькова І. Д., Гусева Д. С. і заяву дэпутата Кавалёва А. Ф., даручае дэпутату Кісялёву Кузьме Венедзіктавічу (Парыцкая выбарчая акруга, Палеская вобласць) прадставіць прапановы аб складзе ўрада, улічыўшы пры гэтым крытычныя заўвагі дэпутатаў, выказаныя ў ходзе спрэчак».

На гэтым ранішняе пасяджэнне Вярхоўнага Совета БССР закрываецца.

(БЕЛТА).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Аб пасяджэнні Першай Сесіі Вярхоўнага Совета Беларускай ССР 1-га склікання 28 ліпеня 1938 года

28 ліпеня ў зале пасяджэнняў Дома ўрада адбылося шостае, заключнае пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР першага склікання.

Старшынствуе старшыня Вярхоўнага Совета БССР дэпутат **Грэк Н. Г.**

Вярхоўны Совет прыступае да разгляду пытання аб фарміраванні Совета Народных Камісараў БССР.

Дэпутат **Кісялёў** Кузьма Венедзіктавіч уносіць на разгляд Вярхоўнага Совета састаў Совета Народных Камісараў БССР.

Тав. **Кісялёў** у свайй прамове адказвае на заўвагі дэпутатаў, зробленыя на папярэднім пасяджэнні ў спрэчках па пытанню аб утварэнні ўрада БССР.

Персанальным галасаваннем Вярхоўны Совет утварае ўрад БССР — Совет Народных Камісараў БССР у наступным саставе:

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР —

Кузьма Венедзіктавіч КІСЯЛЕЎ.

Намеснікі старшыні Совета Народных Камісараў БССР —

Іван Антонавіч ЗАХАРАЎ

і Міхаіл Васільевіч КУЛАГІН.

Старшыня Дзяржаўнай планавай камісіі —

Ісак Львовіч ЧОРНЫ.

Народны Камісар мясцовай прамысловасці —

Іван Сямёнавіч КАРОВІН.

Народны Камісар лёгкай прамысловасці —

Владзімір Іванавіч ДЗМІТРЫЕЎ.

Народны Камісар лясной прамысловасці —

Владзімір Барысавіч ГАЙСІН.

Народны Камісар харчовай прамысловасці —

Ільля Іванавіч ГОРЫН.

Народны Камісар земляробства —

Пётр Аляксеевіч КАЛЬЦОЎ.

Народны Камісар зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў —

Аляксей Іванавіч ДРУЖЫНІН.

Народны Камісар гандлю —

Владзімір Грыгор'евіч ВАНЕЕЎ.

Народны Камісар унутраных спраў—

Аляксей Аляксеевіч НАСЕДКІН.

Народны Камісар юстыцыі —

Сяргей Цярэнцьевіч ЛОДЫСЕЎ.

Народны Камісар аховы здароўя —

Іван Антонавіч НОВІКАЎ.

Народны Камісар асветы —

Еўдакія Ільінічна УРАЛАВА.

Народны Камісар комунальнай гаспадаркі —

Васілій Сцяпанавіч ЗАБЕЛА.

Народны Камісар фінансаў —

Іван Захаравіч СЦЯПАНАЎ.

Народны Камісар соцыяльнага забеспячэння —

Еўдакія Трафімаўна ГУЦЯНКОВА.

Начальнік дарожнага ўпраўлення —

Васілій Парамонавіч КАПУСЦІН.

Начальнік упраўлення па справах мастацтваў —

Абрам Барысавіч ОЗІРСКІ.

Сесію Вярхоўнага Совета БССР прышлі вітаць дэлегацыі ад піонераў і школьнікаў і слаўнай Чырвонай Арміі.

Ад імя дэлегацыі дзяцей выступілі піонеры **Сідараў** і **Іванова**, ад дэлегацыі Чырвонай Арміі — тав. **Анікін.**

Парадак д[illegible] сесіі вы[illegible]рпан. Старшыня Вярхоўн[illegible] БССР тав. **Грэк Н. Г.** канстат[illegible] усіх пытаннях парадку дня Вя[illegible] С[illegible]там прыняты аднадушныя [illegible] абвяшчае Першую Сесію Вярхо[illegible] Совета БССР закрытай. (БЕЛТА)

соцыялістычную рэволюцыю, дыктатуру пролетарыята.

А на з'ездзе былі і адкравенныя праціўнікі гэтага патрабавання. Адкравенны апартуніст Акімаў патрабаваў убраць з праграмы асноўнае патрабаванне дыктатуры пролетарыята. «Цвёрдыя» іскраўцы аднадушна далі яму рэзкі адпор. Злейшы вораг народа Троцкі ўжо тады выступіў праціўнікам дыктатуры пролетарыята, салідарызаваўся з поўкадэтам Акімавым.

Велізарнае, прынцыповае, гістарычнае значэнне мелі спрэчкі па нацыянальнаму пытанню на II з'ездзе. Прадстаўнікі польскіх соцыял-дэмакратаў і бундаўцы выступалі супроць права нацый на самавызначэнне, супроць пролетарскага інтэрнацыяналізма, іграючы на руку царызму. Ленін і Сталін, большэвікі, заўсёды адстайвалі права нацый на самавызначэнне, як прынцыповае патрабаванне, на аснове якога пролетарыят прыцягвае на свой бок шырокія масы прапоўных прыгнечаных нацыянальнасцей.

Другі з'езд пацвердзіў ленінскую ацэнку партыі эсэраў як дробна-буржуазных авантурыстаў, як левай фракцыі буржуазнай дэмакратыі, здольнай служыць толькі ліберальнай буржуазіі. Метал індывідуальнага тэрора і рэволюцыйныя фразы, якімі эсэры прыкрывалі сваю буржуазную сутнасць, рабілі гэту партыю «шкоднай не толькі для палітычнага развіцця пролетарыята, але і для агульнадэмакратычнай барацьбы супроць абсалютызма».

Па пытанню аб адносінах да лібералаў ленінцы далі апартуністам бой. Ленінцы выкрывалі здрадніцкую сутнасць рускай ліберальнай буржуазіі і яе прэсмыкацельства перад царызмам. Ленінцы гаварылі, што рабочаму класу трэба злучыцца з сялянствам і павесці яго на бой супроць царызма. Верныя халопы буржуазіі — апартуністы, узначальваемыя Мартавым і Троцкім, прапанавалі заключыць саюз з буржуазіяй, падпарадкаваць пролетарыят кіраўніцтву буржуазіі.

Асабліва вострыя спрэчкі разгарнуліся вакол статута партыі. Ленін пострасна адстайваў арганізацыйныя погляды, развітыя ў кнізе «Что делать?», бо гутарка ішла аб тым, ці будзе створана партыя як перадавы, арганізаваны рэволюцыйны атрад пролетарыята

Ленінская фармуліроўка першага параграфа статута дакладна ўстанаўлівала, што членам партыі можа лічыцца толькі той, хто прызнае праграму партыі, хто падпарадкоўваецца партыі, прызнае партыйную дысцыпліну для сябе абавязковай, хто цалкам аддае сябе справе партыі. Кожны член партыі павінен уваходзіць у адну з партыйных арганізацый.

Супроць Леніна выступілі ўсе апартуністы, узначальваемыя Мартавым і Троцкім. Меншавікі імкнуліся да стварэння шырокай дробнабуржуазнай «рабочай партыі», у якой перадавыя, рэволюцыйныя рабочыя танулі-б у масе апартуністычна настроеных, дробнабуржуазных элементаў.

У рэзка процілеглых фармуліроўках першага параграфа статута партыі, прапанаваных з аднаго боку Леніным, а з другога боку Мартавым, сутыкнуліся пролетарскі цэнтралізм і дысцыпліна з буржуазным анархічным індывідуалізмам.

На II з'ездзе галасамі «мяккіх» іскраўцаў, «балота» і антыіскраўцаў была прынята фармуліроўка Мартава, у якой прапанавалася лічыць членамі партыі ўсіх, хто хоць чым-небудзь абяцае дапамагчы партыі, хаця і не ўваходзіць у партыйную арганізацыю, не падпарадкоўваецца партыйнай дысцыпліне.

Толькі III з'езд вясной 1905 г. прыняў ленінскую фармуліроўку першага параграфа статута партыі.

Гістарычны вопыт паказаў, якое велізарнае значэнне мела большэвіцкае разуменне членства партыі.

Важнейшай справай II з'езда было размежаванне з апартуністамі. «Падзяленне на большасць і меншасць,— пісаў па поваду расколу Ленін,—ёсць прамы і немінучы працяг таго падзялення соцыял-дэмакратыі на рэволюцыйную і апартуністычную, на Гару і Жыронду, якое не ўчора толькі паявілася, не ў адной толькі рускай рабочай партыі і якое, напэўна, не заўтра знікне».

Фармальна раскол адбыўся па пытанню аб складзе цэнтральных устаноў партыі, а на справе-ж раскол адбыўся па пытанню аб тым, ці будзе ў нас сапраўдная пролетарская партыя, здольная ўзначаліць барацьбу рабочага класа і забяспечыць яго гегемонію ў рэволюцыйным руху.

Па поваду расколу, які адбыўся на II з'ездзе, апартуністы з II Інтэрнацыянала ўзнялі вялікі шум. Цэнтрам нападак быў Ленін. У той час калі няўстойлівыя, непартыйныя элементы хныкалі па поваду расколу, абвінавачваючы ў ім «непрымірымага» Леніна і «цвёрдакаменных» большэвікоў, Ленін пісаў: «Якая выдатная рэч — наш з'езд!.. Адкрытая, свабодная барацьба. Думкі выказаны. Адценні абрысаваліся. Групы намеціліся. Рукі ўзняты Рашэнне прынята. Этап пройдзен. Наперад!»

Зусім ясна, што без разрыву з апартуністамі, без рэзкага размежавання, без расколу з імі не магла-б узнікнуць тая выдатная арганізацыя большэвікоў, якая зараз стаіць на чале першай у свеце краіны перамогшага соцыялізма, не было-б партыі Леніна—Сталіна, перадавога атрада Комуністычнага Інтэрнацыянала. Аб важнасці гэтага разрыву з апартуністамі напомніў таварыш Сталін у заключным слове на XV партыйным з'ездзе.

Другі з'езд паклаў пачатак існаванню большэвіцкай партыі — партыі новага тыпу.

Ленін і Сталін працавалі над стварэннем баявой рэволюцыйнай партыі, «дастаткова смелай для таго, каб павесці пролетарыяў на барацьбу за ўладу, дастаткова вопытнай для таго, каб разабрацца ў складаных умовах рэволюцыйнай абстаноўкі, і дастаткова гібкай для таго, каб абыйсці ўсе і ўсякія падводныя камені на шляху да мэты» **(Сталін).**

З II з'езда партыя большэвікоў выступае як самастойная сіла, хоць фармальна яшчэ на працягу раду год астаецца пад агульным сцягам РСДРП «Большэвізм існуе, як плынь палітычнай мыслі і як палітычная партыя, з 1903 года» У жыцці партыі пасля былі моманты, калі яна рабіла спробы ўстанаўлення адзінага фронта з рабочымі, ідучымі за меншавікамі, і ішла дзеля гэтага нават на часовыя аб'яднанні з меншавіцкімі арганізацыямі, як гэта было, напрыклад, на IV Аб'яднаўчым з'ездзе РСДРП у 1906 годзе. Але з II з'езда з 1903 года рэволюцыйнае крыло марксізма, крыло ленінцаў набывае ва ўсім міжнародным рабочым руху значэнне самастойнай партыі — партыі большэвікоў, хоць канчаткова большэвікі аформілі гэта выдзяленне толькі ў 1912 годзе, на VI Пражскай агульнапартыйнай канферэнцыі.

Другі з'езд даў партыі праграму, статут і рашэнні па найбольш важных пытаннях рэволюцыйнай барацьбы пролетарыята. На II з'ездзе ў 1903 годзе адбываецца першы вялікі агляд усяго ідэйнага багажа партыі, адбываецца расстаноўка асноўных сіл у РСДРП: большэвізм — з аднаго боку, меншавізм — з другога. Фашысцкі обер-бандыт Троцкі яшчэ на II з'ездзе партыі быў тыповым меншавіком — ворагам пролетарскай цэнтралізаванай партыі і рэволюцыйнай палітыкі.

Раскол на II з'ездзе меў вялікае міжнароднае значэнне. У абарону апартуністычнай пазіцыі меншавікоў выступілі лідэры II Інтэрнацыянала. Абараняючы партыю і партыйнасць, Ленін, большэвікі вялі барацьбу і супроць расійскага і супроць міжнароднага апартунізма. Адбыўшаяся на II з'ездзе барацьба вакол асноўных праграмных, тактычных і арганізацыйных пытанняў тлумачыць разгарнуўшуюся пасля з'езда барацьбу паміж паслядоўнымі прыхільнікамі ленінізма і апартуністамі, якія па-меншавіцку скажаюць марксізм. Гэта барацьба пасля з'езда ўзмацнілася, рознагалоссі паміж большэвікамі і меншавікамі абвастрыліся і прынялі яшчэ больш акрэслены характар.

Сталін у час работ II з'езда РСДРП знаходзіўся ў ссылцы, куды атрымаў пісьмо ад Леніна. Пісьмо Леніна «давала смелую, бясстрашную крытыку практыкі нашай партыі і вельмі яснае і сціслае выкладанне ўсяго плана работы партыі на бліжэйшы перыяд». У студзені 1904 года таварыш Сталін уцякае з ссылкі ў Закаўказзе і становіцца на чале большэвіцкай барацьбы за партыю, за скліканне III з'езда.

На месцах разгарнулася барацьба з меншавікамі і прымірэнцамі, барацьба за партыю, пачалася падрыхтоўка да склікання III з'езда. У гэтай барацьбе загартоўваліся рады ленінцаў, большэвікоў.

У той час як усе цэнтральныя ўстановы партыі (Совет партыі, Цэнтральны орган — «Искра» і Цэнтральны Камітэт) аказаліся ў руках меншавікоў, Ленін разгарнуў кіпучую дзейнасць па згуртаванню адданых партыі большэвікоў. Ленін апублікаваў у маі 1904 года кнігу «Шаг вперед, два шага назад (кризис в нашей партии)», у якой даў падрабязны аналіз работ II з'езда і пасляз'ездаўскай дэзарганізатарскай дзейнасці меншавікоў. Ленін указваў, што на з'ездзе і пасля з'езда змагалася рэволюцыйнае крыло партыі (большэвікі) з апартуністамі-меншавікамі, ворагамі баявой партыі рабочага класа.

12—14 жніўня ў Жэневе пад кіраўніцтвам Леніна адбылася нарада 22 большэвікоў, якія звярнуліся да партыі з адозвай падрыхтаваць выбары на III з'езд партыі. У кастрычніку-лістападзе адбыліся тры канферэнцыі ў Расіі: Каўказская, Паўднёвая і Паўночная, якія выказаліся за неадкладнае скліканне III з'езда і зацвердзілі Бюро камітэтаў большасці.

Велізарную работу па выкрыццю меншавікоў і згуртаванню партыйных арганізацый вакол Леніна правёў у Закаўказзі таварыш Сталін, пад кіраўніцтвам якога былі распушчаны Бакінскі і Тыфліскі камітэты, якія складаліся з меншавікоў, і створаны большэвіцкія камітэты.

За працяжэнне рэволюцыйных традыцый старой «Искры», супроць меншавіцкай новай «Искры» выступіла арганізаваная Леніным у снежні 1904 года газета «Вперед», першы нумар якой вышаў 4 студзеня 1905 года.

Палітычная дзейнасць Леніна, яго барацьба супроць розных антыпролетарскіх плыняў у рэволюцыйным руху ў Расіі з самага пачатку мела глыбокае міжнароднае значэнне.

Са стварэннем большэвіцкай арганізацыі барацьба Леніна супроць апартуністаў у другім Інтэрнацыянале набывае яшчэ больш рэзкі характар.

Гэта лінія Леніна на разрыў, на раскол з апартуністамі і цэнтрыстамі ў міжнародным маштабе выклікае барацьбу супроць яго з боку ўсіх апартуністаў II Інтэрнацыянала. Кіраўніцтва II Інтэрнацыянала на чале з Каўцкім у пытанні аб расколе РСДРП аднадушна стала на бок меншавікоў. Большэвікі асталіся на міжнароднай арэне адны, акружаныя варожасцю і нянавісцю апартуністаў.

«Левыя» ў другім Інтэрнацыянале слепа ішлі на паваду ў апартуністаў тыпу Каўцкага і таксама выступілі супроць большэвікоў.

У 1904 годзе на кангрэсе II Інтэрнацыянала большэвіцкая партыя не толькі фактычна, але і фармальна проціпаставіла сябе, як самастойная, адзіна рэволюцыйная партыя, усяму міжнароднаму апартунізму.

***

Уся барацьба Леніна да II з'езда партыі, на самым з'ездзе і ў пасляз'ездаўскі перыяд з'яўлялася ўзорам глыбокай прынцыповасці, непрымірымай ідэйнай барацьбы супроць усякіх ухіленняў ад рэволюцыйнага марксізма.

Таварыш Сталін пісаў: «Чым узяла тады верх большэвіцкая частка партыі, чым яна заваявала сімпатыі большасці партыі? Тым, што яна не замазвала прынцыповых рознагалоссяў і змагалася за пераманне гэтых рознагалоссяў шляхам ізаляцыі меншавікоў».

Трыццаць пяць год прайшло з часу II з'езда РСДРП. У трох рэволюцыях, а затым на працягу 20 год пролетарскай дыктатуры падвергліся самай глыбокай, усебаковай праверцы прынцыпы большэвізма. Створаная Леніным і Сталіным арганізацыя большэвікоў стала ўзорам для ўсіх партый Комуністычнага Інтэрнацыянала. А тыя, хто змагаўся супроць Леніна, — меншавікі, трацкісты, бухарынска-рыкаўскія рэнегаты, — сталі прамой агентурай, саюзнікамі і выканаўцамі волі фашыстаў.

Большэвіцкая праграма, стратэгія, тактыка і арганізацыйныя прынцыпы з'яўляюцца ўзорам для міжнароднага пролетарыята, для Комуністычнага Інтэрнацыянала. Вучэнне Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна ёсць адзіна правільная рэволюцыйная тэорыя і тактыка, якія забяспечылі канчатковую і беспаваротную перамогу соцыялізма на адной шостай частцы свету і забяспечаць перамогу соцыялістычнай рэволюцыі ва ўсім свеце.

Пад вялікім сцягам марксізма-ленінізма рабочы клас пераможа ва ўсім свеце.

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР 1-га СКЛІКАННЯ

ПАСЯДЖЭННЕ 28 ЛІПЕНЯ 1938 ГОДА

ПРАМОВА тав. К. В. КІСЯЛЁВА

АБ СТВАРЭННІ ЎРАДА БССР—СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Таварышы дэпутаты! Вярхоўны Совет даручыў мне прадставіць на зацвярджэнне састаў Совета Народных Камісараў Беларускай рэспублікі.

У сваім рашэнні Вярхоўны Совет прапанаваў улічыць усе крытычныя заўвагі, выказаныя дэпутатамі ў сваіх выступленнях на данай Сесіі па пытанню ўтварэння ўрада. Гэтыя крытычныя заўвагі мною ўлічаны і, у адпаведнасці з імі, уношу прапанову аб саставе Совета Народных Камісараў.

Раней, чым перайсці да састава Совета Народных Камісараў, я хачу спыніцца на тых крытычных заўвагах, якія былі выказаны дэпутатамі Вярхоўнага Совета: Мельнікавым, Маркіным, Кавальковым, Гусевым.

Гэтыя таварышы ў сваіх выступленнях спыніліся на рабоце раду наркаматаў. З іх крытычнымі заўвагамі я поўнасцю згодзен.

Пачну з пытання дзейнасці Наркамлеса.

Тав. Рыжыкаў працуе наркомам з дня арганізацыі наркамата. Здавалася-б, новы наркамат па-новаму, па-большэвіцку павінен быў-бы паставіць справу лясной прамысловасці, аднак мы гэтага не бачым. Тав. Рыжыкаў пагруз у канцылярска-бюракратычных метадах работы наркамата. Сапраўднага стану работы лясной прамысловасці (работы мехпунктаў, леспрамгасаў) тав. Рыжыкаў не ведае.

Арганізацыяй працы, поўным скарыстоўваннем механізмаў наркамат не займаўся, таму наркамат лясной прамысловасці па ўсіх паказальніках працуе надзвычай нездавальняюча.

Прадстаўляючы па вашаму даручэнню свае прапановы аб саставе ўрада, я ўлічыў заўвагі і крытыку, якія мелі месца на Сесіі Вярхоўнага Совета аб рабоце наркома тав. Рыжыкава, у адпаведнасці з гэтымі крытычнымі заўвагамі прадстаўляю прапанову аб кіраўніцтве Наркамлеса.

Далей, я хачу спыніцца на рабоце Наркамзема. Кіраўніцтва Наркамзема прышлося мяняць у гэтым годзе. Аднак мы не бачым паляпшэння работы наркамата. Саюзны ўрад аказаў і аказвае вялікую дапамогу калгаснаму сялянству Совецкай Беларусі ў справе ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы.

Гістарычнай пастановай ЦК ВКП(б) і Соўнаркома Саюза ад 2 жніўня 1937 года калгаснікам вернуты прысядзібныя ўчасткі, калгасам перададзены ў вечнае карыстанне сотні тысяч гектараў лясных угоддзяў. 81 проц. калгасаў маюць зараз свае калгасныя лясы.

Саюзным урадам аказана вялікая дапамога ў механізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі. На калгасных палях у канцы гэтага года будуць працаваць звыш 8 тысяч трактараў, звыш тысячы камбайнаў і дзесяткі тысяч складаных сельскагаспадарчых машын. Побач з гэтым выраслі і новыя людзі ў сельскай гаспадарцы. Звыш тысячы камбайнераў, дзесяткі тысяч трактарыстаў, тысяча аграномаў і іншых спецыялістаў. Усё гэта забяспечыла і забяспечвае далейшы рост заможнасці і культуры калгаснага сялянства. Усё гэта патрабуе новых метадаў кіраўніцтва з боку Наркамзема. Наркамзем і зямельныя органы рэспублікі яшчэ не сталі аператыўным штабам кіраўніцтва сацыялістычнай сельскагаспадарчай вытворчасцю.

Прадстаўляючы свае прапановы аб саставе ўрада, я ўлічыў усе заўвагі і крытыку работы наркома земляробства, якія мелі месца на Сесіі Вярхоўнага Совета.

У адпаведнасці з гэтымі заўвагамі і крытыкай уношу свае прапановы.

Дэпутаты Вярхоўнага Совета крытыкавалі работу Наркамгандлю. Нельга не прызнаць гэту крытыку абсалютна аб'ектыўнай. Дзейнасць Наркамата гандлю звязана з задавальненнем надзённых запатрабаванняў грамадзян нашай рэспублікі. Саюзны ўрад, Цэнтральны Камітэт ВКП(б) аддаюць вялікую ўвагу пытанню арганізацыі совецкага гандлю.

Саюзны ўрад у гэтым годзе адпусціў больш прамысловых і харчовых тавараў, чым у мінулым годзе. Запатрабаванне насельніцтва ўвесь час павялічваецца. Расце заможнасць гарадскога і сельскага насельніцтва. Наша Совецкая Беларусь, пры дапамозе Саюзнага ўрада і ЦК ВКП(б), становіцца з года ў год багацей. У гэтых умовах работа гандлёвых арганізацый набывае асобае значэнне. Шырокае разгортванне тавараабароту ў горадзе і вёсцы павінна забяспечыць узрослыя запатрабаванні працоўных. Нельга сказаць, што ў нас тавараў мала. Тавары ёсць, але трэба ўмець прасунуць гэтыя тавары да нашых совецкіх спажыўцоў. Трэба справу арганізаваць так, каб гэтыя тавары не залежваліся на гандлёвых базах і складах.

З гэтай задачай Наркамгандаль і нарком тав. Шаўроў не справіліся.

Пры ўнясенні свайёй прапановы аб саставе ўрада мною ўлічаны заўвагі і крытыка ў адносінах наркамата гандлю і яго кіраўніцтва.

Наркамат мясцовай прамысловасці заклікан забяспечыць выраб прадметаў шырокага спажывання з мясцовых рэсурсаў і з мясцовай сыравіны, даць спажыўцу нашай рэспублікі высокаякасны тавар, разгарнуць работу раённай прамысловасці, асабліва па вырабу будаўнічых матэрыялаў і тавараў шырокага спажывання.

Работа Наркаммясцпрома і яго наркома тав. Каровіна на сёнешні дзень з'яўляецца нездавальняючай. На наркамат мясцовай прамысловасці ўскладзена задача развіцця тарфяной прамысловасці, як асноўнай энергетычнай базы рэспублікі. З гэтай задачай Наркаммясцпром спраўляецца крайне слаба. Нарком тав. Каровін вылучан нядаўна на гэту работу. У далейшым тав. Каровіну патрэбна па-большэвіцку выправіць недахопы ў рабоце Наркаммясцпрома.

Я лічу, што Наркаммясцпром будзе карыстацца асобай увагай і дапамогай з боку Совета Народных Камісараў БССР.

Аб рабоце Наркамасветы тут выступаў дэпутат тав. Кавалькоў, падвергшы зусім справядлівай крытыцы работу гэтага наркамата. Я з гэтай крытыкай цалкам згодзен.

Па даручэнню Сесіі ў маёй прапанове аб саставе ўрада ўлічаны асаблівасці работы Наркамасветы.

Я запэўняю Сесію, што работа Наркамасветы будзе ў цэнтры ўвагі Совета Народных Камісараў. Новае кіраўніцтва гэтага наркамата павінна забяспечыць выдатную падрыхтоўку да вучэбнага года.

Таварышы дэпутаты, тут была падвергнута крытыцы работа некалькіх наркаматаў. Гэта не азначае, што ў астатніх наркаматах справа абстаіць добра. Вядома, гэта не так. Астатнія наркаматы маюць таксама рад буйных недахопаў у сваёй рабоце. Соўнаркому і наркаматам патрэбна ўлічыць заўвагі і крытыку, меўшыя месца тут, на Сесіі Вярхоўнага Совета, і палепшыць дзейнасць кожнага наркамата.

Крытыка, якая разгарнулася на данай Сесіі, акажа вялікую дапамогу Совету Народных Камісараў у яго рабоце, бо за работу наркаматаў адказвае Совет Народных Камісараў. І тая крытыка па адрасу асобных наркаматаў і Совета Народных Камісараў, якая мела тут месца, будзе ўлічана, і Совет Народных Камісараў прыкладзе ўсе намаганні да таго, каб выправіць указаныя недахопы.

Работа Совета Народных Камісараў і наркаматаў яшчэ далёка не стаіць на тым узроўні, на якім яна павінна быць. Трэба мець на ўвазе, што Саюзны ўрад, асабліва Совет Народных Камісараў Саюза і асабіста таварыш Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў **(гучныя, працяжныя апладысменты)** аказваў і аказвае вялікую жывую, непасрэдную дапамогу, выпраўляючы недахопы ў рабоце Соўнаркома БССР. Пры гэтых умовах мы, несумненна, павінны працаваць лепш.

Цяпер дазвольце перайсці да састава ўрада.

Сесіяй даручана мне сфармаваць урад БССР, таму я не спыняюся на пытанні аб Старшыні Совета Народных Камісараў.

Пераходжу да намеснікаў Старшыні Совета Народных Камісараў і ўношу наступную прапанову:

Зацвердзіць намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў БССР Івана Антонавіча **Захарава**.

Уношу таксама прапанову зацвердзіць намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў Міхаіла Васільевіча **Кулагіна**.

Уношу прапанову зацвердзіць:

Старшынёй Дзяржаўнай Планавай Камісіі Ісака Львовіча **Чорнага**;

Народным Камісарам Мясцовай Прамысловасці — Івана Сямёнавіча **Каровіна**;

Народным Камісарам Лёгкай Прамысловасці — Владзіміра Іванавіча **Дзмітрыева**;

Народным Камісарам Лясной Прамысловасці — Владзіміра Барысавіча **Гайсіна**;

Народным Камісарам Харчовай Прамысловасці — Ілью Іванавіча **Горына**;

Народным Камісарам Земляробства—Пятра Аляксеевіча **Кальцова**;

Народным Камісарам Зернавых і Жывёлагадоўчых Соўгасаў — Аляксандра Іванавіча **Дружыніна**;

Народным Камісарам Гандлю — Владзіміра Грыгор'евіча **Ванеева**;

Народным Камісарам Унутраных Спраў—Аляксея Аляксеевіча **Наседкіна**;

Народным Камісарам Юстыцыі — Сяргея Цярэнцьевіча **Лодысева**;

Народным Камісарам Аховы Здароўя—Івана Антонавіча **Новікава**;

Народным Камісарам Асветы—Еўдакію Ільінічну **Уралаву**;

Народным Камісарам Комунальнай Гаспадаркі — Васілія Сцяпанавіча **Забела**;

Народным Камісарам Фінансаў — Івана Захаравіча **Сцяпанава**;

Народным Камісарам Сацыяльнага Забеспячэння — Еўдакію Трафімаўну **Гуцянкову**;

Начальнікам Дарожнага Упраўлення—Васілія Парамонавіча **Капусціна**;

Начальнікам Упраўлення па справах мастацтваў — Абрама Барысавіча **Озірскага**.

Вось састаў Совета Народных Камісараў, складзены мною ў адпаведнасці з арт. 45 Канстытуцыі БССР.

Таварышы дэпутаты! БССР пры дапамозе Саюзнага ўрада і ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), дзякуючы асабістай увазе кіраўніка Саюзнага ўрада Вячэслава Міхайлавіча Молатава і бацькоўскім клопатам аб беларускім народзе Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, стала адной з перадавых рэспублік вялікага Совецкага Саюза. Уся гэта выключная дапамога і клопаты ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна з'яўляюцца яркім выражэннем таржаства ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, ажыццяўляемай Саюзным урадам пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна. **(Усе ўстаюць і наладжваюць бурную авацыю ў гонар таварыша Сталіна).**

Пад кіраўніцтвам ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта, пры дапамозе совецкай разведкі разгромлены асноўныя гнёзды ворагаў — трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, якія праводзілі падрыўную, шпіёнскую работу ў Беларусі.

Беларуская рэспубліка становіцца з года ў год багацей, і гэта б'е па ворагах, якія імкнуцца перашкаджаць нашаму пераможнаму будаўніцтву і адарваць Совецкую Беларусь ад вялікага Совецкага Саюза.

Наша рэспубліка знаходзіцца на заходняй граніцы вялікага Совецкага Саюза. На нас ускладзена задача ўсямернага садзейнічання і дапамогі нашым слаўным пагранічнікам у ахове совецкай граніцы.

Беларускі народ з гэтай задачай спраўляецца нядрэнна. Ён і надалей будзе пільна, разам з пагранічнікамі ахоўваць непрыступнасць нашых граніц.

Соўнарком і надалей будзе праводзіць работу па ўмацаванню і аказанню дапамогі нашай Чырвонай Арміі і нашым слаўным пагранічнікам.

Паспяховае рашэнне гаспадарчых задач — адно з важнейшых мерапрыемстваў па ўмацаванню абароназдольнасці нашага Совецкага Саюза.

Соўнарком павінен яшчэ больш узяць пад свой непасрэдны кантроль работу асобных наркаматаў, аказваць ім дапамогу, своечасова выпраўляць іх памылкі і замяняць не адпавядаючых справе кіраўнікоў. Кожны з дзяржаўных кіраўнікоў павінен памятаць мудрае ўказанне таварыша Сталіна, сказанае ім на прыёме металургаў і гарнякоў: «...быць кіраўніком у совецкіх умовах — значыць удастоіцца высокага гонару і давер'я ў вачах народа... Кіраўнікі прыходзяць і ўходзяць, а народ астаецца. Толькі народ бяссмертны. Усё астатняе — прэхадзяшчэ. Таму трэба ўмець даражыць давер'ем народа».

Умець даражыць давер'ем народа — такі асноўны абавязак Совета Народных Камісараў. Такі асноўны абавязак кожнага з дзяржаўных кіраўнікоў.

Мы, кіраўнікі, пастаўленыя воляй народа, воляй ленінска-сталінскай партыі, павінны памятаць, што поспех нашай работы будзе тым значнейшы, чым больш і чым мацней будзе ажыццяўляцца наша штодзённая і жывая сувязь з многамільённымі масамі працоўных.

Совет Народных Камісараў Беларускай Рэспублікі прыкладзе ўсе свае намаганні да таго, каб апраўдаць высокае давер'е беларускага народа, давер'е Вярхоўнага Совета.

Няхай жыве наш свабодны беларускі народ!

Няхай жыве Беларуская Совецкая Сацыялістычная Рэспубліка і яе вышэйшы орган — Вярхоўны Совет!

Няхай жыве ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве наш вялікі правадыр і настаўнік таварыш Сталін! **(Дэпутаты наладжваюць бурную авацыю ў гонар таварыша Сталіна. Аркестр выконвае «Інтэрнацыянал». Воклічы: «Правадыру народаў вялікаму Сталіну ура!», «Вялікаму Сталіну ура!», «Лепшым саратнікам таварыша Сталіна Ура!», «Мудраму Сталіну ура!», «Тварцу самай дэмакратычнай у свеце канстытуцыі таварышу Сталіну ура!»).**

Гарачае прывітанне калектыву чырзонасцяжнай Дзяржаўнай філармоніі Совецкага Узбекістана!

НАМ АПЛАДЫРАВАЎ ТАВАРЫШ СТАЛІН

Дарагія таварышы! Ад імя працоўных сонечнага Узбекістана і калектыва ордэнаноснай Узбекскай філармоніі перадаю большэвіцкае прывітанне працоўным братняй Беларускай рэспублікі.

З пачуццём глыбокай радасці прынялі мы прапанову паехаць у Беларусь, паказаць шчасліваму беларускаму народу рост і росквіт нашай нацыянальнай культуры.

Узбекістан у мінулым, да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі быў адсталай калоніяй царскай Расіі. Толькі дзякуючы Вялікаму Кастрычніку, толькі дзякуючы мудрай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы комуністычнай партыі, узбекскі народ, як і ўсе народы нашай вялікай краіны, атрымаў шчаслівае, раднаснае заможнае жыццё.

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі расце і мацнее Совецкі Узбекістан — роўнапраўная рэспубліка ў адзінай сям'і братніх совецкіх народаў.

Наш ансамбль арганізаваўся ў канцы 1936 года. У склад ансамбля ўвайшлі лепшыя таленавітыя спевакі, танцоры і музыканты—рабочыя і калгаснікі Узбекістана.

У мінулым годзе мы мелі вялікі гонар паказаць народнае мастацтва нашай рэспублікі працоўным чырвонай сталіцы СССР. Нас бачыў, нам апладыраваў вялікі Сталін і яго баявыя саратнікі.

Партыя і ўрад высока ацанілі наша майстэрства. Філармонія, у склад якой уваходзіць і наш ансамбль, была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Урад узнагародзіў ордэнамі Саюза ССР народных артыстаў Кары Якубава, Таш-Мухамедава, Міронава, засл. арт. Шырозі. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга быў узнагароджан і я, акрамя таго мне было нададзена званне народнага артыста Узбекістана.

Я, у мінулым бяспраўны, забіты і прыгнечаны узбек, які гнуў сваю спіну на баеў, стаў цяпер народным артыстам. У сваіх песнях я ўслаўляю вялікую нашу радзіму, партыю большэвікоў, правадыра і настаўніка ўсіх народаў таварыша Сталіна.

Сёння мы пакажам сваё народнае мастацтва працоўным Менска. Мы рады сустрэцца з беларускім народам — нашым другам і таварышам.

Наша прывітанне, прывітанне рабочых і калгаснікаў сонечнага Узбекістана, працоўным Совецкай Беларусі.

ТАХТАСЫН ДЖАЛІЛАЎ,

народны артыст УзССР, ордэнаносец, мастацкі кіраўнік ансамбля музыкі, песні і танцаў Узбекістана.

РАДАСНАЯ СУСТРЭЧА

У 8 гадзін раніцы 27 ліпеня ў Менск прыехаў калектыў чырвонасцяжнай Дзяржаўнай філармоніі УзССР — ансамбль музыкі, песні і танцаў Узбекістана. На вакзале дарагіх гасцей братняй рэспублікі сустракалі чырвонаармейцы, беларускія работнікі мастацтваў і піонеры.

Поезд падыходзіць да станцыі. Насустрач яму гучыць урачысты марш. З вагона выйшлі прадстаўнікі сонечнай рэспублікі. У гонар сустрэчы узбекскі аркестр у складзе нацыянальных інструментаў — карная, сурная, чэльдармы (бубна) і інш. выканаў прывітальны марш. Работнікі мастацтваў і піонеры ўручылі артыстам букеты кветак.

Тут-жа, на пероне, адбыўся мітынг. Ад працаўнікоў беларускага мастацтва узбекскіх артыстаў вітаў рэжысёр тав. Літвінаў. З прывітальнымі прамовамі выступілі таксама прадстаўнік узбекскага падраздзялення Менскага гарнізона і прадстаўнік ад піонераў і школьнікаў ордэнаноснай сталіцы. З адказным словам выступіў рэжысёр Філармоніі УзССР Атабаеў.

Ансамбль, якім кіруе народны артыст УзССР ордэнаносец Тахтасын Джалілаў, прыехаў да нас упершыню.

Гэты здольны калектыў у складзе 80 чалавек, пры ўдзеле народнага артыста УзССР Кары Якубава, салістаў балета — ордэнаносца Розе Карымава, і Ісахара Акілава, Назара Задэ і героя працы Ахмеджан Умурзакава, прадэманструе ў Менску лепшыя ўзоры узбекскага мастацтва.

Ансамбль ужо выступаў у Гомелі, Віцебску і Рэчыцы, дзе заслужана карыстаўся вялікім поспехам.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам дырэктар і палітычны кіраўнік ансамбля тав. Ісламаў паведаміў:

— Мы рады і шчаслівы, што беларускі народ так горача прымае мастацтва нашага народа, разумее той шчаслівы настрой, якім жывем мы. Толькі ў рэзультаце геніяльнай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі магчыма сапраўдная братняя дружба народаў.

У дзень прыезду, увечары, узбекскія артысты выступілі перад дэпутатамі Вярхоўнага Совета БССР. Выбраннікі беларускага народа віталі прадстаўнікоў роднага узбекскага народа доўга незмаўкаючымі апладысментамі. Асаблівы ўздым у прысутнічаўшых на канцэрце выклікала песня, прысвечаная правадыру народа таварышу Сталіну. Канцэрт закончыўся воклічамі ў гонар геніяльнага тварца самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі — Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Ансамбль прабудзе ў Менску 12 дзён і пакажа 12—15 канцэртаў узбекскай музыкі, песні і танцаў.

А. Е.

В. Г. КАРАЛЕНКА

(Да 85-годдзя з дня нараджэння)

Смелае выступленне Караленкі ў абарону сялян-вацякоў, якія абвінавачваліся ў рытуальным забойстве, абляцела ўсю Расію. Нарысы «У галодны год», надрукаваныя ў 1893 годзе, скаланулі чытачоў праўдзівым адлюстраваннем голаду і бязлітаснага цынізму памешчыкаў і царскіх чыноўнікаў. У 1902 годзе Караленка разам з Чэхавым адмовіўся ад звання ганаровага акадэміка, пратэстуючы супроць выключэння М. Горкага з складу акадэмікаў.

Кожнае грамадскае выступленне прагрэсіўнага пісьменніка знаходзіла жывы водгук у асяроддзі працоўных і выклікала злобную істэрыку чорнасоценнага друку.

Але да гэтага Караленка прайшоў цяжкі шлях выпрабаванняў і пакут. Калі ў канцы 70 гадоў XIX стагоддзя выйшлі з друку першыя творы Караленкі, жандар Расіі Александр III і яго саноўнікі адчулі ў пісьменніку свайго лютага ворага. Спачатку Караленку выслалі ў Валагодскую губерню, потым пасадзілі ў Вышневалоцкую палітычную турму, а пасля, у 1881 годзе, калі Караленка адмовіўся ад прысягі цару і яго сатрапам, яго выслалі ў аддалёны край Якуцкай вобласці — слабаду Амгу.

На працягу пяці год Караленка не мог нічога надрукаваць, хоць за гэты час ім былі напісаны шырокавядомыя творы «Сон Макара» і «Сакалінец».

Як пісьменнік, В. Г. Караленка вырас пад непасрэдным уплывам дэмакратычнай літаратуры 60—70 гадоў, раней за ўсё пад уплывам Глеба Успенскага. Ён пільна назіраў буржуазнае «аднаўленне» Расіі, назіраў за разарэннем і паўперызацыяй сялянства.

В. Г. КАРАЛЕНКА

Караленка піша аб трагедыі працоўнага чалавека ва ўмовах капіталізма і ў «Паўлаўскіх нарысах» уздымаецца да ўсведамлення неадхільнасці супярэчнасцей паміж працай і капіталам.

У нарысе «Парадокс» ён вуснамі бязрукага фокусніка гаворыць, што «чалавек створан для шчасця, як птах для палёту».

У аповесці «Сляпы музыкант» Караленка стварыў вобраз сляпога, які страсна марыць аб празрэнні: Пісьменнік у гэтым творы праз псіхалагічны эцюд трактуе ідэю чалавечага імкнення да шчасця і святла.

У выдатнай па мастацкай прыгажосці мініятуры «Аганькі» выказваецца ідэя аб тым, што ніякім змрокам нельга патушыць чалавечыя імкненні, мысль і волю чалавека.

Асноўная тэма ў творчасці Караленкі — чалавек, абураны сваім пастылым існаваннем і лёсам раба, чалавек, у якім незгасальна жаданне дасягнуць шчасця і святла. Гэта тэма была невымерна вышэй таго сантыментальнага кірунку, які культывіраваўся ў позненародніцкай белетрыстыцы.

Мастацкія шэдэўры, створаныя Караленкам, ставяць яго ў адзін рад з імёнамі буйнейшых майстроў слова, у якіх настойліва вучацца лепшыя совецкія пісьменнікі.

Караленка карыстаецца заслужанай любоўю совецкага народа. Яго кнігі шырока распаўсюджаны, і кожнае новае выданне яго твораў радасна сустракаецца чытачом. Апавяданні і аповесці Караленкі перакладзены на многія мовы народнасцей Совецкага Саюза.

ГАСТРОЛІ ВІЦЕБСКАГА ТЭАТРА Ў МЕНСКУ

Віцебскі дзяржаўны беларускі тэатр пачынае свае гастролі ў Менску пасля двухгадовага перарыву.

За гэтыя два годы тэатр творча вырас. Яго рэпертуар папоўніўся п'есамі аб жыцці і барацьбе беларускага народа супроць белапольскіх бандытаў («У пушчах Палесся»), аб імперыялістычнай вайне («Вайна—вайне»). Абедзве п'есы належаць пяру народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа. Тэатр з уменнем і належнай мастацкай культурай скарыстаў вадэвілі Янкі Купалы. На сцэне тэатра з'явілася п'еса «Мяшчане» вялікага рускага пісьменніка М. Горкага, над якой тэатр папрацаваў удумліва і плённа.

Тэатр паставіў два спектаклі аб рэвалюцыйнай пільнасці — «Вочную стаўку» і «Агні маяка», хоць апошні па сваіх ідэйна-мастацкіх якасцях далёка не адпавядае тэме.

Творчы актыў тэатра, яго вядучыя акторы — засл. арт. рэсп. Ільінскі, Малчанаў, Кашэльнікава, Сяргейчык, Звездачотаў і іншыя ў гэтых спектаклях паказалі далейшы рост сцэнічнага майстэрства. Асабліва неабходна падкрэсліць вялікую работу акт. Ільінскага над вобразамі дзеда Талаша і Бессеменава, акт. Малчанава над вобразамі Ларцэва і Перчыхіна, акт. Кашэльнікавай над вобразам Елены («Мяшчане»), акт. Сяргейчыка над вобразам шпіёна Келера.

Тэатр багата папрацаваў над устанаўленнем шчыльных творчых сувязей з беларускімі совецкімі драматургамі. Апрача Якуба Коласа і Янкі Купалы, п'есы якіх знаходзяцца ў рэпертуары тэатра, Віцебскі дзяржаўны тэатр прыцягнуў да работы над п'есамі пісьменнікаў З. Бядулю, П. Глебку, Ю. Віцьбіча, М. Паслядовіча, І. Гурскага. Глебка ўжо ў асноўным напісаў для тэатра п'есу аб дружбе народаў.

Дадатным у рабоце тэатра з гэтымі драматургамі з'яўляецца тое, што яна пашырае тэматыку беларускай драматургіі. Драматургі працуюць над п'есамі аб заможным і радасным калгасным жыцці, аб жыцці пагранічнікаў, аб пільнасці беларускага народа.

Заслугай тэатра з'яўляецца тое, што не гледзячы на шкодніцкую палітыку былога кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў, якая выявілася ў забароне беларускім тэатрам працаваць над п'есамі, дзе выведзен вобраз Владзіміра Ільіча Леніна, Віцебскі тэатр ўсё-ж уключыў у свой рэпертуар п'есу «Чалавек з ружжом» Н. Пагодзіна і зараз працуе над яе пастаноўкай.

Гаворачы пра дадатную работу, пра творчы рост тэатра, неабходна з усёй сур'ёзнасцю падкрэсліць наяўнасць буйнейшых недахопаў у яго рабоце.

Гэта ў першую чаргу датычыць справы вырошчвання маладых акторскіх кадраў. Тэатр у гэтым напрамку амаль нічога не зрабіў, калі не лічыць работу маладой артысткі Гарэлавай над вобразам Полі ў спектаклі «Мяшчане».

Віна за гэта ў значнай меры кладзецца на былое мастацкае кіраўніцтва тэатра, якое не арганізавала творчай вучобы з маладымі акторамі і вылучэння іх на адказныя ролі. Наогул у кіраўнікоў тэатра палітыка-выхаваўчая работа і творча-тэхнічная вучоба не ў пашане. Тэатр яшчэ не дабіўся адзінства мастацкага стылю ва ўсіх сваіх спектаклях. Часам асобныя спектаклі больш паказальны для характарыстыкі творчага профілю рэжысёра, чым калектыва тэатра. Кіраўніцтва тэатра яшчэ не здолела па-сапраўднаму згуртаваць увесь калектыў тэатра вакол хвалюючых творчых праблем.

Партыйная, комсамольская і прафсаюзная арганізацыі тэатра не ўзнагальваюць імкнення лепшых работнікаў тэатра да далейшага ўзняцця ідэйна-мастацкага ўзроўню рэпертуару тэатра, не клапоцяцца аб выхаванні маладых актораў.

Здзіўляе абыякавасць партарганізацыі тэатра і яе парторга тав. Блюдзіса да творчых пытанняў, да хваравітых з'яўшчаў у тэатры.

Недахопам у рабоце тэатра з'яўляецца тое, што яшчэ не наладжана творчая дружба паміж старэйшым акторскім пакаленнем і маладымі акторамі калектыва.

Работа Віцебскага тэатра была-б значна лепшай, каб ім па-большэвіцку кіравала Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР. На прыкладзе «кіраўніцтва» Упраўлення Віцебскім тэатрам зноў відаць нягодны стыль работы гэтай установы.

Тэатр справядліва чакае ад новага кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў большэвіцкай дапамогі ў вырашэнні ўсіх пастаўленых перад ім нашым шчаслівым народам задач, дапамогі ў стварэнні хвалюючых, праўдзівых мастацкіх твораў, вартых нашай найвялікшай у свеце эпохі.

Д. М.

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбелу № М—903.